Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem

СЛОВА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул. 12—6** (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Някрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	**Цана абвестак:** перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 9 Вільня, Серада 31-га кастрычніка 1928 г. Год 1

Хто вінаваты?

Яшчэ нядаўна Лодзь прыкоўвала ўвагу цэлай Польшчы, калі ня ўсей Эўропы. Лодзкія работнікі на валакняных фабрыках, даведзеныя да крайняга ўбоства, атрымліваючы ў дзень столькі, колькі прамысловец выкідвае на адну пачку добрых папяросаў, абвесьцілі забастоўку. Іх дружна падтрымалі работнікі іншых лодзкіх прадпрыемстваў. Хваля забастовак гатова была перакінуцца на ўсе прамысловыя цэнтры Польшчы, як салідарнасьць з лодзкімі работнікамі. Польская буржуазія спалохалася. Здавалася, што дзень перамогі працы над капіталам нарэшце настане.

Але, вось газэты падаюць, што па волі нечыяй дырыжэрскай палачкі пажар забастоўкі патухае і работнікі паступова вяртаюцца да сваіх станкоў, прайграўшы амаль што не па ўсяму фронту. „Табелі караў", якія аканчальна ўзбадаражылі працаўнікоў фабрыкаў, як насьмешка над асобай работніка, ізноў зьявіліся на сьценах лодзкіх фабрыкаў. Польская буржуазная прэса трыумфуе, а так званая „сацыялістычная" (панашаму — угодовая) саромліва абходзіць прычыны няўдачы, ці ўсю віну ўскладае на камуністаў, якія „справакавалі" так удачна паўстаўшую і выкліканую „стараньнямі" „казённых сацыялістаў" забастоўку, пакіраваўшы яе па неадпаведным (для буржуазіі і польскіх „сацыялістаў" з пад фірмы П. П. С.) шляху. А ўрадавыя газэты, праліваючы сьлёзы над горкай нядоляй лодзкага работніка (?), стараюцца даказаць, што ўсе стараньні ўраду прывесьці забастоўку да добрых вынікаў (якіх?) не прынясьлі скутку, бо прамыслоўцы ўпорчывы і гэтым умываюць свае рукі.

У асьвятленьні праўды прыпомнім прабег усей забастоўкі. Работнікі, убачыўшы першы раз „табелі караў", якія былі вывешаны на сьценах лодзкіх фабрыкаў, далей сьцярпець не маглі. Даведзеныя да крайнасьці ўбоствам, яны абвясьцілі забастоўку, дамагаючыся, ня толькі здыйму ганебных для іх „табеляў", але разам і паляпшэньня эканамічнага дабрабыту, як падвышэньня заработнай платы і др. Уплыў на работнікаў захапілі прадстаўнікі М. П. Р., Пэпээсы і іншыя „сацыялістыя", каб ня страціць сваю павагу сярод работнікаў мусілі „хаця ці не хаця" да забастоўкі прылучыцца. Пасрэдніцтва Ураду тут не памагло, бо праціўныя стораны, як работнікі, так і прамыслоўцы на кампрамісыісьці не жадалі.

Забастовачны рух перакінуўся на ўсе лодзкія прадпрыемствы. Забаставалі навет працаўнікі магістрату. Як рэха гэтай забастоўкі, пачалі паўставаць забастоўкі і ў іншых прамысловых цэнтрах Польшчы. Кіраваньне забастоўкай цалком перашло да камуністаў, якія тут адкрыта выступілі з падпольля. ППС спалохаліся нечаканага для іх звароту справы. Забастоўка даходзіла да свайго зэніту і была на пярэдадні поўнай перамогі работнікаў. Прамыслоўцы ўжо думалі аб новай канфэрэнцыі з прадстаўнікамі работнікаў.

Але ў гэты час кіраўнікі прафэсыянальных работніцкіх саюзаў, апанаваных пэпээсамі, пастанавілі прызнаць, што работнікі далей ня вытрываюць і падпісалі з прамыслоўцамі ўмову аб распачацьці працы. Азлобленыя работнікі, не належачыя да пэпээсаўскіх прафсаюзаў, склікалі канфэрэнцыі, на якіх абгаварваліся варункі падпісаньня зборнай умовы і вынесьлі цэлы чарод пратэстаў проці тактыкі ППС. У канцы пастанавілі дамагацца новай канфэрэнцыі з прамыслоўцамі.

Але першы крок зроблены і „брэш" у агульным работніцкім фроньце прабіта. ППС зрабілі „ўслугу" сваім хлебадаўцам. Забастоўка стараньнямі ППС ліквідуецца.

Гэты факт яшчэ раз яскрава падкрэсьлівае „працу" сацыял-угоды і даказвае, што ППС, відаць, страшней рост уплыву на работнікаў камуністаў, чым сама эксплёатацыя працы капіталам.

Ці патрабуюць работнікі пры такім здэмаскаваньні сацыял-угоды яшчэ раз помачы кіраўнікоў ППС—сумліўна.

Хто тут вінават, хіба дагадаецца сам чытач, а мы затрымліваемся на гэты раз ад далейшага об'ектыўнага разгляду такога важнага здарэньня з жыцьця работніцкае клясы, як лодзкая забастоўка, па вядомым прычынам.

Капітал трыумфуе, але ці надоўга?...

За родную школу.

У вялікі сьвет пратэсту голас
Мы кінем, брацьця, дружна свой —
Уставай, гуртуйся наша моладзь,
Выходзь ты з цемраю на бой.

Выходзь, нясі свой штандар сьмела;
Твары магутную сям'ю.
Мы змагары сьвятога дзела
За школу родную сваю.

Мы постаць сьветласьці імкненьняў,
Пажар між цемры старых дзён —
Нясем сьвятло для пакаленьняў
Нясем цямноце мы праклён.

Даволі „апекі" нам наўкола,
Даволі ў цемры нас глуміць...
Гэй, трэба родную нам школу!
Асьвету родную здабыць.

К табе прыгожасьць правасудзьдзя
І справядлівасьці язык,
З грудзей ляціць—ляцеці будзе
Пратэсту, крыўды, гучны зык.

Удар балючы за ўдарам
На нас скіраваны, браты,
Ахопіць сэрца ледзь пажарам,
Шпарчэй сон зьнішчыць пракляты.

Дружней-ж, дружней, сьмялей хто чэсны!
Хто шчыры сын свае зямлі:
Падаймо сільны гук пратэсту,
Мы зможам усё, што не змаглі!

М. Васілёк.

За кулісамі „нябывалага гаспадарчага росквіту" Амэрыкі.

Набліжаючыяся ў краі прэзыдэнцкія выбары, у часе якіх маюць суткнуцца паміж сабой, ня толькі дзьве найвялікшыя, амаль ня роўныя па сіле партыі—„рэспубліканцаў" і „дэмакратаў", рэпрэзэнтуючыя магутныя арміі краёвай буржуазіі—буйнейшай і драбнейшай, мястовай і вясковай (фэрмераў): пэўную ролю маюць адыграць і суадносна слабыя работніцкія партыйныя арганізацыі.

Як часта пішацца і гаворыцца, „у Амэрыцы няма работніцкага пытаньня",—„няма сацыялізму"... Няма — дзеля таго, што там быццам—„няма падставаў для іх паўстаньня",—„няма тэй беднаты, таго ўціску і вызыску, якія пануюць у Эўропе"...

Трэба дадаць толькі, што няма ўсяго гэтага афіцыяльна—няма таму, што амэрыканскі ўрад і пануючая ў краі неабмежавана буйная буржуазія не прызнаюць існаваньня ўсяго гэтага...

І вось, толькі цяпер — у часе надыходзячых выбараў — ня толькі робіцца больш чутны голас работніцкіх масаў, церпячых ад страшэннай бяды, але і самі канкуруючыя партыі буржуазіі неяк пачынаюць зьвяртаць увагу на гэты голас, пачынаюць прызнаваць існаваньне „работніцкага пытаньня" ў краі; закідаць адна аднэй віну ў жыцьцёвым заняпадзе работніцкіх масаў, прыкідваючыся— у мэтах здабыцьця работніцкіх галасоў — прыяцелямі і абаронцамі работніцкай клясы"...

—

Запраўды-ж, — не прайшло і году ад часу, калі былы міністар гандлю і прамысловасьці сучаснага ўраду, а цяпер кандыдат у прэзыдэнты з боку ўрадавай партыі „рэспубліканцаў", „муж даверыя" буйнейшай буржуазіі, ведамы Гувэр, апублікаваў свой „рэкордны адчот" за 1927 г., у якім — у запраўды-ж задзіўляючых лічбах сьцьвердзіў „нябывалы фінансава - прамысловы ўздым краю".

А вось цяпер—у найпаважнейшых органах фінансава-гаспадарчай думкі амэрыканскай буржуазіі—усьцяж расьце трывога перад тэй „сьветлай будучыняй бязьмежнага росквіту", якую такімі вясёлкавымі фарбамі рысаваў п. Гувэр...

І тутака мы адразу спатыкаемся з тым самым „работніцкім пытаньнем", якое, ставячы сабе чыста тэхнічныя і фінансавыя задачы ўласнага збагачэньня і разбудовы прамысловасьці і не зважаючы на працаўніка—чалавека—тварца гэтага багацьця,—абвесьціла „ня—існуючымі" амэрыканская буржуазія.

—·—

Як ведама, сучасная прамысловая тэхніка высунула так рэклямаваны цяпер прынцып „навуковай арганізацыі працы". Прынцып гэты мае даць прадукцыі, як кажуць — „максімум машыны і мінімум жывога работніка"; навет самога гэтага работніка, суадказнай дрэсыроўкай — ператварыць у машыну! Прынцып гэты, асабліва шырока тасаваны ў Амэрыцы, даў ёй запраўды-ж нячуваны поступ у павялічэньні выдатнасьці прадукцыі. Але гэты-ж прынцып, тасаваны выключна з пагляду тэхнічна-фінансавага, без паразуменьня з інтарэсамі работніцкай клясы, залішне слаба арганізаванай у краі, каб змусіць лічыцца з сабой, усім цяжарам лёг на амэрыканскі пралетарыят, выкінуўшы вялізарныя масы работнікаў з працы. Такім чынам, аднабокі поступ—побач з „прамысловым росквітам" краю—стварыў вялізарную армію безработных.

Армія безработных дайшла таксама да нячуванай ў Амэрыцы, заўсёды ўвозіўшай да сябе неабмяжавана работнікаў эмігрантаў з усяго сьвету,—да лічбы звыш 4 мільёнаў...

Амэрыканская статыстыка падае такую „прапорцыю" ўзросту выдатнасьці прадукцыі ў краі з аднанасным спадкам учасьця ў прадукцыі работніцкай сілы за апошнія 8 гадоў.

Калі прыняць за 100 агульную вытворчасьць ў краю і агульную лічбу занятых ў ёй работнікаў у 1923 г., тады—ў 1919 г. вытворчасьць выразіцца лічбай 84, а лічба работнікаў (працуючых) у краі—108,2; у 1926 г. — вытворчасьць паднялася да 108, тады як лічба працуючых работнікаў упала; ці інакш— за 8 гадоў прадукцыйнасьць краю ўзрасла на 24% а ўчасьце ў ёй жывога работніка зьменшылася на 16%!!

Такім чынам „гаспадарчы росквіт краю" ў значнай меры адбыўся коштам работніцкай клясы, якой ён—ня толькі ня даў справядлівай долі ўчасьця ў тым, што створана пераважна яе працоўнай сілай, але да таго яшчэ і значна пакрыўдзіўшы яе!...

Скуткі такога хібнага „росквіту" коштам жывога работніка сказаліся вельмі хутка: у цэлым сьцягу галінаў прамысловасьці пачаўся крызіс над-прадукцыі. Ведама, як выхваляў слаўны Форд сваю сыстэму высокіх платаў работнікам—з мэтай, каб яны маглі купляць яго аўтамабілі, пашыраючы тым унутраны рынак для яго фабрыкатаў... Але гэтая „аўтамабільная ідылія" канчаецца на нашых вачох: прыйшоў крызіс і ў аўтамабільную прамысловасьць, якая пачала таксама выкідаць работнікаў, тасуючы—дзеля канкурэнцыі—ўсе вастрэй—„навуковую арганіцыю працы", а тым самым усьцяж паглыбляючы крызіс... Раздаваныя работнікам „на раты" аўтамабілі і іншыя рэчы пачалі адбірацца назад праз суды, бо работнікі, выкінутыя з працы, не спаўнялі „ўмовы", якая прадбачыла акуратныя сплаты „ратаў"... Пачалося хваляваньне работніцкіх масаў у краі, шукаючых ратунку ў бядзе...

Амэрыканскі ўрад наагул—„не прызнае" існаваньня безработных, не вядзе ніякай статыстыкі ў гэтай галіне, ня робіць нічога для іх аховы і запамогі...

Амэрыканскае „жыцьцёвае правіла" кажа, што — „кожны павінен сам сабе памагаць"... Такім чынам афіцыяльна і дакладна нічога аб лічбе і лёсе гэтых мільёнаў безработных няведама. Існуе затое — прыватная статыстыка—ня менш точная. Але пагроза расьце ўсьцяж, даводзячы ўсім работнікам відавочна рэальную неабходнасьць стварэньня шырокай клясавай арганізацыі дзеля абароны сваіх правоў і інтарэсаў, а перадусім—надставога права на жыцьцё і працу!

Узрост гэтай арміі безработных даецца ўжо ў знакі амэрыканскай буржуазіі з усіх бакоў. Ня кажам ужо аб шалёным узросьце праступнасьці ў краі за апошнія гады. Але некалькі мільёнаў спажыўцоў у краі, пазбаўленых здольнасьці набываньня тавараў, гэта-ж—датклівае звужэньне ўнутранага рынку для краёвай прадукцыі, — лішняя прычына прамысловага крызісу ў краі, выкліканая наагул адсутнасьцяй новых рынкаў для награмаджаных таварных запасаў у краі. Гэты крызыс б'е ўжо ня толькі работнікаў, але і буржуазію.

Такім чынам — у выніку „нячуванага гаспадарчага росквіту" — Амэрыка ідзе да нейкай сацыяльна-гаспадарчай катастрофы, межы якой — цяжка навет прадбачыць. Гэтую катастрофу амэрыканская буржуазія пэўне-ж спрабуе ў суадказны час „папярэдзіць", — тэй ці іншай ваеннай авантурай!

—·—

Вось у такіх абставінах ідзе цяпер у Амэрыцы выбарная прэзыдэнцкая кампанія. Такі стан рэчаў дае апазіцыйнай партыі — „дэмакратаў", ня кажучы ўжо аб больш левых, не буржуазных аб'яднаньнях, значныя козыры ў рукі пры агітацыі проці ўрадавай партыі.

Павадыр і кандыдат „дэмакратаў" (сярэдняй і драбнейшай буржуазіі, у тым ліку — хлебаробаў-фэрмераў) і канкурэнт Гувэра — Сміт — ёсьць, як ведама, губэрнатарам найвялікшага па значэньню і насяленьню штату і места Нью-Іорка. Галоўная барацьба і мае ісьці паміж гэтымі двума кандыдатамі. У галіне парушанага намі тутака пытаньня, выбарная барацьба гэта мае тое значэньне, што —сама канкуруючая двума сваімі лагерамі— „рэспубліканскім" і „дэмакратычным" буржуазія — раскрывае цяпер шмат тэй праўды аб „гаспадарчым росквіту" краю, — праўды, якую шчыльна хавае супольнымі стараньнямі абедзьвюх партыяў у часы нармальнай працы над „уздымам краю" — шляхом выкіданьня мільёнаў працаўнікоў на вуліцу — без усялякай аховы і апекі!...

Эўропа гуляе у „разбраеньне", а Кітай умацняецца.

Яшчэ ня так даўна амаль увесь буржуазны сьвет голасна, на ўвесь сьвет пяяў песьню пацыфізму. Прадстаўнікі буржуазіі сабраліся ў Парыжы і падпісалі вядомы ўсім „Пакт Кэллёга", згодна якога вайна абвяшчалася як вялікае бяспраўе (нарэшце дадумаліся!), што калі хто пачнець вайну, дык увесь сьвет павінен рушыць проці яго. Здавалася, што спакой і згода, пасьля гэтага, павінны запанаваць паміж народамі навек, што страшная мара вайны адыйшла ў мінуўшчыну назаўсёды. Але... гэта толькі здавалася. Не пасьпела буржуазія адгуляць свой „мядовы месяць вечнай згоды", як мара вайны зноў вышчарыла свой страшны твар. Амаль у той самы дзень, калі прадстаўнік Англіі падпісваў у Парыжы „Пакт Кэллёга", у Англіі спускалі на ваду новы вялізны ваенны карабель. А праз некалькі дзён пасьля гэтага стала вядомым, што паміж Англіяй і Францыяй нядаўна падпісаны тайны ваеннаморскі дагавор...

Такім чынам, буржуазія, з усім сваім цынізмам даказала, што ўсякія яе гутаркі аб абязброеньні і вечным пакою — хлусьня і абман, а падпісаныя ёй дагаворы—бязвартасныя кускі паперы і больш нічога, што буржуазія ніколі не зрачэцца выпусьціць з сваіх рук зброю, пры помачы якой яна сотні гадоў панавала і пануе над працоўнымі. І калі радавы прадстаўнік Літвінаў на канфэрэнцыі з трыбуны Лігі Народаў заклікаў народы ўсяго сьвету да агульнага і аканчальнага разбраеньня, буржуазія цынічна сьмяялася з яго і казала, што гэта не магчыма. Ведае добра яна, што ў той дзень, калі-б усе ваенныя прылады былі б зьнішчаны, а апошнія гарматы, стрэльбы, шаблі і гэт. да-

лей былі-б пераробдены на машыны і плугі, дык і панаваньне яе назаўсёды скончылася-б... А дзеля таго, пачала яна яшчэ з большай ярасьцяй загатаўляць зброю і выдумваць розныя новыя страшнейшыя сродкі дзеля зьнішчэньне людзей.

Але, навет самы найлепшы сродак, часам дзее у іншым, зусім адменным кірунку. Гэтак, напрыклад, царская зброя ў руках працоўных дапамагла скінуць самога цара, адчыніла дзьверы вялікай „турмы народаў", а на мейсцы якой запанавала работніцка-сялянская ўлада. А таксама зброя ангельскіх, японскіх, французкіх і амэрыканскіх капіталістых, калі папала ў руку працоўнага кітайскага народу, на век скінула чужацкае ярмо.

Яшчэ пару гадоў таму назад можна было лічыць шаленствам сьмелы шаг кітайскіх патрыётаў, якія кінуліся ў няроўную барацьбу з чужацкім панаваньнем і сацыяльным вызыкам сваей і чужацкай буржуазіі.

Вялізны кітайскі край, быў падзелены на сфэры ўплываў розных кітайскіх гэнаралаў, якія, не саромячыся, бралі грошы ад усюль, дзе толькі можна і служылі толькі таму, хто больш даваў. За грошы ціснулі свой кітайскі народ, за грошы ваявалі гэнэрал проці гэнэрала, змагаючыся не за свае кітайскія, а за чужацкія англійскія, японскія ці іншыя інтарэсы. Кожны вызвольны шаг кітайскай беднаты тапілі яны ў моры крыві. Але не застрашыла гэта кітайскіх працоўных. Нясучы сотні тысяч ахвяраў, яны пачалі аб'ядноваць Кітай, праганяючы прэч наемных гэнаралаў. Гісторыя вызвольнай кітайскай барацьбы хіба добра кожнаму ведама і мы ня будзем напамінаць аб ёй у нашым невялічкім артыкуле. Спынімся на апошняй вестцы, якая шмат каго ўстрывожыла.

Гэта—вестка аб тым, што кітайскія ўлады запрасілі вядомага з часаў сусьветнай вайны нямецкага гэнарала Людэндорфа на галоўнага арганізатара і камандуючага кітайскай арміі. Як вядома, гэнарал Людэндорф пакуль што выслаў за сябе палкоўніка нямецкага гэнаральнага штабу Баўэра. На першы пагляд, здаецца, нічога надзвычайнага ў гэты няма: кітайцы могуць запрашаць да сябе каго хочуць. Адаак, у гэтым крыецца глыбейшая прычына, выклікаеая патрэбамі выдатнай палітыкі Кітаю, Радавых Рэспублік і Нямеччыны. Кітаю патрэбна сільная армія, каб прагнаць японцаў, якія захапілі кітайскую частку Манчжуры і ўтрымліваюць там розных гэнаралаў-наёмнікаў, якімі пагражаюць спакою на паўночных граніцах Кітаю. А таксама Японія і да гэтай пары ўтрымлівае на Кітайскім моры свае ваенныя караблі, якія паралізуюць свабоду рухаў кітайскай флёты.

Сільная армія запэўніць кітаю мірнае будаваньне і разьвіцьцё краю ўнутры. Таксама сільная кітайская армія можа стацца найлепшым чыньнікам вызваленьня і іншых азіяцкіх народаў, якія да гэтай пары знаходзяцца пад чужацкім панаваньнем. Найбольшым з такіх народаў зьяўляецца Індыя з больш як 370 мільёнаў жыхароў, якія стогнуць пад англійскім панаваньнем. Яшчэ ў мінулым годзе дэлегаты ад Індыйскіх народаў да рэвалюцыйнага кітайскага ўраду з просьбай аб дапамозе ў вызвольнай барацьбе з англійскімі акупантамі. Але аслаблены доўгай хатняй вайной Кітай ня мог тагды прыйсьці Індыйскім народам з помачай.

І толькі маючы сільную армію, спакой і лад у краі, зможа аказаць помач Індыі тагды, калі на гэта зайдзе патрэба.

Індыя—гэта балючае месца для Англіі. Страціўшы Індыю, Англія страціць усю сваю сілу, багацьце. Індыя — край невычарпанага багацьця, якое Англія бесцарамонна заграбае сабе, будуючы за гэта ваенныя караблі, гарматы, аэрапляны...

Чуючы, як усё больш і больш прабуджаюцца Індыйскія народы, як з кожным разам узрастае нездаволеньне проці англійцаў, бачучы, як то тут, то там выбухаюць паўстаньні проціў „Індыйскіх урадаў", пастаўленых і купленых англійцамі, прадчуваючы, што канец англійскага панаваньня над Індыяй няўхільна набліжаецца, Англія паступова аслабляе свой строгі рэжым акупацыі, праклямуючы навет „незалежную Індыю", але... пад англійскім каралём.

Англія найбольш усяго на сьвеце баіцца проціў-англійскай агітацыі ў Індыі і за гэта навет парвала дыплёматычныя зносіны з Радавымі Рэспублікамі.

Дарэмна хітрая Англія круціцца, як вуж. Дарэмна падпісвае адной рукой „пакт Келёга", а другой рукой „ваенна-марскі дагавор з Францыяй". На Далекім Усходзе настае новая эра вызваленьня вялікіх азіяцкіх народаў...

Ці не азначае гэта адначасна пачатак зьмярканьня буржуазнай Эўропы?

Пажывём — пабачым...

Паны „абразіліся".

„Związek Ziemian" (Саюз Абшарнікаў) паведаміў м-ва Працы, што датуль ня прыйме ўчасьця ў перагаворах аб падпісаньні зборнай ўмовы з Прафсюзам Рольных Работнікаў, пакуль дэлегатам гэтага саюзу будзе яго цяперашні старшыня пас. Квапінскі.

Гэтае паведамленьне „Ziemianie" тлумачаць „вельмі радыкальным" артыкулам Квапінскага, зьмешчаным у „Хлопскай Праўдзе", у якім між іншым напісана „наволыване да замаху ладу".

„А калі б хто хацеў йсьці на авантуры за голасам абшарнікаў, то няхай-жа яны (ziemianie) ведаюць, што пакуль войска змагалася-б (uporałobu się) з работніцкімі арганізацыямі, дык у першым радзе будуць загрожаны „шляхэтныя" горлы абшарнікаў"...

„Ня лічыце на Пілсудскага, бо ён ня ў сіле абараніць вас перад гневам сялянскіх масаў".

Рэха камуністычнага працэсу ў Пазнані.

У сувязі з нядаўна адбыўшымся ў Пазнані працэсам проці вядамай камуністкі Бэнькоўскай, буржуазная прэса падае аб цэлым радзе камуністычных „правакацыяў і замахаў".

Яна інфармуе, быццам ведамы камуніст Зыгмунт Козіцкі замахваўся (нядаўна) на жыцьцё галоўнага сьведкі працэсу некага Вацлава Ратайчака.

Апрача гэтага, у дзень працэсу камуністы раскідалі вялізарны лік адозваў, заклікаючых да салідарнасьці з лодзкай забастоўкай, а камуніст Алфрэд Бэм падаў у суд двух урадоўцаў паліцыі за ашуканства і ілжу (oszczerstwo), а іншага паліцянта за тое, што той самавольна ўварваўся ў яго дом...

Тысячы сем'яў без страхі над галавой.

У Варшаве нядаўна скончыўся апошні сьпіс дамоў. якім пагражае заваленьне. Такіх дамоў налічана аж 154. Усе яны на акраінах горада і поўны работніцкай беднаты, якая будзе з іх выселена як найхутчэй, г. з. аж ў гэтым кастрычніку. Выселена будзе, згодна з інфармацыямі варшаўскай прэсы, 4,500 душ, або больш тысячы сем'яў.

Частка гэтых дамоў будзе адрэмантавана, а рэшта збурана... Гэта яшчэ больш павялічыць кватэрны голад у Варшаве, які й без таго не зьмясьціўся ўва ўсёх больш менш надаючыхся да жыцьця гарадзкага пралетарыяту бараках і т. падобных норках.

А побач з такой духатой пралетарыяту ў гвілах і цёмных сутарэнах і бараках, стаяць вялізарныя панскія палацы, у якіх паны жывуць.

Польска-літоўскія перагаворы.

У пачатку лістапада г. г. ў Крулеўцу распачнуцца польска-літоўскія перагаворы.

Польская дэлегацыя, на чале з мін. загр. спраў Залескім, выяжджае туды 2 лістапада. Разам з дэлегацыяй едуць экспэрты (знаўцы): чыгуначныя, акцызныя, гранічнага руху, тэлеграфічныя, тэлефонічныя і іншыя, якія бралі ўдзел у папярэдніх польска-літоўскіх перагаворах.

Афіцыяльная польская прэса інфармуе, што польская дэлегацыя выступіць толькі са старымі праектамі.

Калі так, то ўжо ведама, чым канчаюцца перагаворы.

Заграніцай.

Перагаворы аб перaглядзе польска-францускага гандлёвага трактату.

15-га лістапада ў Парыжу маюць распачацца перагаворы ў справе грунтоўнага перагляду польска-францускай гандлёвай умовы, падпісанай у 1924 г. Як ведама, умова гэта — ня вельмі карысная для Польшчы, якая — за палітычнае падтрыманьне з боку Францыі—павінна плаціць ёй залішне цяжкімі для польскага гандлёвага балянсу, — а карыснымі для францускага ўвозу ў Польшчы—варункамі. Цяпер польскі ўрад, менш залежны ад Францыі, мае дамагацца, як піша польская прэса, больш выгадных для краю варункаў гаспадарчага абмену з Францыяй—на падставе роўнасьці...

Зьдзекі над вязьнямі ў літоўскіх вастрогах.

З Коўны—праз Вільню—даносяць, што ў ковенскім вастрозе выбухнула галадоўка палітычных вязьняў—з прычыны варварскага трактаваньня і пабіцьця вязьняў вастрожнымі ўладамі. Пасол Кэдыс, які ўступіўся за пабітых, кінуты сам у карцар.

Далейшае пагоршаньне англійска-амэрыканскіх стасункаў.

З Лёндаву даносяць, што дрэнныя стасункі паміж Англіяй і Амэрыкай з прычыны падпісаньня „марскога кампрамісу" з Францыяй — пагоршыліся яшчэ больш. Пагоршаньне выклікана зацягіваньнем з боку Англіі ўзнаўленьня „арбітражнага трактату" (аб палюбоўных судох у спорных справах) з Амэрыкай, тэрмін якога скончыўся яшчэ ў чэрвені. Як тлумачыць прэса, Англія „йграе на зацяжку", жадаючы вычакаць рэзультатаў прэзыдэнцкіх выбараў.

Падарожжа п. Паркэра.

П. Джыльбэр Паркэр, які скромна завецца „адшкадаваўчым агентам", а ў запраўднасьці зьяўляецца амаль не фінансавым дыктатарам-паўнамоцнікам амэрыканскага капіталу ўва ўсей Эўропе, вельмі энэргічна ўзяўся за справу перагляду „пляну Доўса" і зьвязанае з ім фінансавае вызваленьне Нямеччыны з саюзьніцкага палону. П. Паркэр пачарзе езьдзіў у Парыж, Лёндан, Брусэль, Рым, дзе асабіста гутарыў з кіраўнікамі дзяржаваў, найбольш зацікаўленых беспасярэдня ў справе адшкадаваньняў. Паводле другіх вестак—п. Паркэр асабіста не паехаў у Рым, але напісаў Мусоліні пісьмо, у якім просіць, каб Мусоліні згадзіўся на тое паразуменьне, якое ўжо дасягнута паміж Англіяй і Францыяй у гэтай справе. Як пішуць газэты, Пуанкарэ заявіў Паркэру, што ад немцаў жадае толькі столькі, скольки Фран-

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Работніцкая забастоўка ў Гдыні.

Надовячы выбухла забастоўка транспартовых работнікаў у порце ў Гдыні. Забаставала каля 100 работнікаў. Яны дамагаюцца падбаўкі платы і прызнаньня прафсаюзу транспортавых работнікаў. У хуткім часе, згодна з Польскай буржуазнай прэсай, забастоўка заламалася і работнікі пачалі прыступаць да працы. Польская прэса бачыць ініцыятыву забастоўкі ў Нямеччыне—бо ў Гдыні былі зьявіліся выданьня ў Нямеччыне і падпісаныя гданскімі транспартоўцамі лятучкі.

Камуністы запісваюцца ў ППС (?!).

Цэнтр. Вык. Камітэт. ППС выдзеліў спэцыяльную камісію дзеля арганізаваньня новага Раб. Камітэту ў Варшаве.

Ц. К. ужо гарачкава прыступіў для рэгістрацыі прыхільнікаў ППС, бо новаму Рабкамітэту трэба выбраць сваіх прадстаўнікоў на кангрэс ППС ў Сасноўцу.

Згодна з інфармацыямі варшаўскай прэсы ў гэты новы Пэпэсаўскі Работніцкі Камітэт масава запісваюцца камуністы, быццам па загаду вышэйшых уладаў, дзеля апанаваньня Пэпэсаўскага Раб. Камітэту.

Напад на „Сельрабоўскага" пасла.

Прэса інфармуе аб нападзе на ўкраінскага сялянска-работніцкага пасла Хама ў Станіслававе. На толькі што прыехаўшага туды і йшоўшага з вакзала, пасла Хама напала 3 няведамых чалавек, якія яго моцна набілі. Падазраюць, што гэта палітычныя парахункі.

Падбаўка ўмысловым працаўнікам.

Надовячы арбітражная камісія закончыла паноўны разгляд падбаўкі для ўмысловых працаўнікоў цяжкага прамыслу Верх. Сьлёнску. Работнікі атрымалі 6,5% падбаўкі. Умова абавязвае да месяца лютага 1929 г.

Асеньняя сэсія Сойму.

Афіцыяльная прэса інфармуе, што асеньняе паседжаньне польскага „парляманту" (Сойму і Сэнату), будзе склікана на 31 г. кастрычніка. Паседжаньне будзе вельмі кароткае, бо абнімае толькі першае чытаньне прэлімінарнага бюджэту на 1929-30 год. 10 лістапада адбудзецца ўрачыстае паседжаньне „парляманту", дзеля ўшанаваньня 10-ўгодкаў Непадлеглнасьці Польшчы, і толькі пасьля гэтага сьвята распачнецца „запраўдная праца" Сойму над бюджэтам.

Уладзімір Астроўскі.

Байка.

Дзесьці, каля ракі Дзьвіны, дзе жывуць паны, жыў сабе бедны селянін-земляроб.

Жыў, цяжка працаваў, усе сілы на працу пакладаў, потам сваю ніўку паліваў,—а бедаваў, бедаваў і бедаваў...

Злыдні, як тыя мышы, у-ва ўсе шчэлкі яго старэнькай халупы залязалі. На саломе спаў. Старым кажушком накрываўся, пад галаву на-нач сумныя думкі падкладаў,—думкі пра заўтрашні горкі дзень, пра сыноў, для якіх зямлі не хапае ды якія выйдуць з хаты ў сьвет на голад і паняверку.

Што будуць яны ў сьвеце рабіць? Дзе знойдуць сабе скарынку штодзеннага хлеба? Можа стануць гаротнымі папіхачамі ў чужынцаў. Можа зьгінуць з голаду пад чужым парканам? Можа выедуць за далёкае мора, каб там стаць белымі нявольнікамі, якімі калісьці былі іх дзяды на Бацькаўшчыне? А можа ў цёмную матку-ночку з голаду возьмуць дубіну ды гайда на шырокую дарогу, а потым згніюць у вастрогах?

Трудна бацьку так варажыць пра сваіх сыноў.

Але-ж мусяць яны кудысьці пайсьці, бо зямлі як няма, так і няма; зямля ня чума, яе не „разьвядзеш".

Каб ім даць грошы, эт так „на шчасьце", можа з грашымі і знашлі-б сабе шматок хлеба!

— Грошай даць? Ха-ха-ха! — горка засьмяяўся, аж сьцены здрыгнуліся.

Палючы, страшны сьмех бедняка-беларуса.

Грошай? А скуль?

Калі розныя павукі перагрызьлі яго кішэні. Ледзь запрацуеш дзе-што, пакладзеш да кішэні, як яны цераз дзюркі і выцеклі. Ізноў запрацуеш, ды ізноў выцякаюць. Так проста ў ляпу вось гэтых павукоў, п'явак ды розных галавасьцікаў. А якія тоўсьценькія ды гладзенькія яны! Якія камянічкі яны маюць! Сколькі нашых грошай у іх!

Цяжка задумаўся небарака-земляроб.

І чуе:

Нешта шэпча яму родная ральля: „Гною дай, а я стану радзіць залатое жытца ды пшанічку на піражкі, ды такія пухлявыя, ружовыя ды белыя, як тварык беларускай дзяўчыны"!

Шэпча яму занядбаны садок: „Дагледзі мяне, а я прагадую цябе і дзетак тваіх"!

Мычыць жалабна кароўка са ўпалымі бакамі: „Пашы, сытнай пашы дай! А я дам табе шмат-шмат малака, а такога густога, як сьметана"!

Гудзяць над яго вухам пчолы: „Дагледзі нас, вулікаў нам новага дай, а мы табе так засалодзім жыцьцё, як толькі можа засаладзіць яго маладая пешчатлівая кабетка, твая Альжбетка".

Усе просяць: „Дай, дай"!

Так зараз гэтыя грошы і возьмеш, калі лезуць яны вун цераз дзіравыя кішэні ў ляпу тых павукоў ды п'явак?!

— Хі-хі! — піскнуў дзесьці павук, — я дам табе грошай, толькі ты дазволь высcаць з цябе вось так працэнтаў са сто ў год!

Схапіўся наш небарака змучанымі рукамі за галаву. Зьвесіў яе, як зьвешвае галінкі плакучая бяроза. А з вачэй яго цураць кроплі за кроплямі і гарачынёй сваей аж зямлю перапальваюць.

— Хто, хто паможа мне? Хто ратуе ад гэтых павукоў ды п'явак? Хто абароніць мяне ад голаду, нявольніцтва, ды страшнай спакусы?

. . . .

Раптам чуе нямы голас:

— Я!

Падняў вочы. Хіснуўся назад. Яскравы бліск асьляпіў яго.

Перад ім — сонечная Байка. Вочы — як зоркі на небе. Тварык — як краска лясная. Вусны так чысты і сьвяты, што хоць маліся ім. Грудзі дыхаюць сонечнай цяплынёй, любоўю і спачуцьцём.

— Я памагу табе! — шэпчуць яе вусны шопатам нашых вясновых узгоркаў,—я ўсё зраблю для цябе, толькі павер мне, толькі ўпусьці мяне ў сваю хату, толькі слухайся мяне! Не абяцанкі-цацанкі сулю табе, не баламуціць цябе зьбіраюся, а памагчы ў тваей нядолі і горы!

Шэпча байка далей свае салодкія, чароўныя словы:

— Я пражану ўсіх тых павукоў ды п'явак. Я зачарую тваю кішэню і ня адзін грош ня выцячэ праз дзюркі твайго кішаня. Я збудую табе новую хату і ў ёй ствару зямны рай: прынясу часопісаў, кніжак, музычных струмэнтаў, радыё. Я дам табе карысную пазычку на гаспадарку. Я дам табе штучныя ўгнаеньні, машыны, прылады. Я прадам выгадна твой хлеб і ўсе твае гаспадарскія прадукты. Я закладу для цябе ўласныя крамкі, фабрыкі, дзе ты сам будзеш купляць, прадаваць і перарабляць прадукты твайго мазаля. Я пабудую для тваіх дзетак родныя школы, народныя дамы, бібліятэкі, спартовыя салі, тэатры і шпіталі. Я выбрукую твае балотныя вуліцы. Я дам тваім беззямельным і малазямельным сынам добра аплачаную работу ў тваіх уласных родных прадпрыемствах. А калі табе прыемна будзе езьдзіць, дам табе веласіпэды, аўтамабільчыкі...

Байка ўкленчыла перад бедным беларускім земляробам і, абымаючы яго калені, благаюча шаптала:

Я ўсё, усё зраблю для цябе. Для сябе-ж я нічога не жадаю. Аднаго толькі вымагаю:—пакахай мяне, ідзі хутчэй за мной. Я дам табе шчасьце, якое ніколі ня сьнілася ні тваім бацькам, ні табе беднаму.

Задумаўся земляроб. Прывык да баламутных абяцанак, а тут—няўжо шчырасьць?

— Перастань быць упартым, — маліла байка,—павер мне—і станецца дзіва. Я вызвалю цябе з нявольніцтва.

— Веру,—нарэшце сказаў земляроб, — веру, бо мушу верыць, што ня можа так вечна быць, што „засьвеціць сонца і ў нашае ваконца". Але скажы мне, мая добрая байка, як імя твае, каб я ведаў, да каго зьвяртацца мне?

Нябескі ўсьмешак пакрыў вусны байкі і, падаючы сваю цудадзейную руку, сказала:

— Маё імя — Каапэрацыя.

Вольны перакл. з украінскага П.

Спадар гілюе.

(Заходня-беларускі расказ. Паўпрацанту фантазіі).

Кандыдат у прафэсары сталічнага ўнівэрсытэту, Янка Спадар рабіў рэпэтыцыю.

Бубніў лекцыю ў Беларускай Гімназіі ў Вільні.

Як толькі пачаў Спадар зьвязіць пра сваяцтва славянскіх моваў, дык з густа заселеных лавак гімназістых пачуўся шык... гік... кацячы канцэрт.

Большасьць слухачоў шуганула ў дзьверы, пакідаючы салю.

Стройны хор вучняў дружна запяяў: „Ад веку мы спалі"...

Лекцыя сарвалася. Цэлую ноч канфэраваў зьвяз „Трох Братоў", — арганізацыя бяз адрэсу, бяз дзеннага сьвятла, без заўсёднага, гэтак кажучы, начулішча.

Назаўтра Спадар прыйшоў добра аглядзець месца свае няўдачы, каб лепш падрыхтавацца да чароднага свайго выступленьня. У руках ён ужо меў здаравенную сукастую палку з роднага дуба.

Пры зьяўленьні Спадара ў рэкрэацыйнай салі пачуўся гэткі магутны, дружны кашаль вучняў, што навет і зусім нармальны чалавек мог-бы крыху страціць сваю раўнавагу. А Спадара дык гэта зусім разьюшыла. Яго шырачэнны рот разьзявіўся, як толькі мог і на ўсю сваю сілу зароў:

— Бандыты!

А ў адказ яму паляцела:

цыя сама павінна плаціць Англіі і Амэрыцы, як сплату ваенных пазыкаў, а таксама — на адбудову зруйнаваных вайной яе тэрыторыяў; Чэрчыль заявіў Паркэру, што вымагае ад немцаў столькі, сколькі Англія сама павінна плаціць Амэрыцы за ваенныя даўгі. Што датычыць Бэльгіі, дык тая трэбуе больш, чым сама павінна плаціць Амэрыцы — бо Амэрыка ...даравала Бэльгіі значную частку яе даўгоў. Як адкажа Мусоліні, які ўжо даручыў свайму спэцыялістаму ў справе адшкадаваньняў улажыць адказ Паркэру, яшчэ ня ведама.

СССР ня будзе плаціць даваенных даўгоў царскага ўраду.

У сувязі з распачынаючыміся працамі міжнароднага камітэту крэдытараў Расеі, — „Известия“ заяўляюць, што праца і ўсе забегі гэтага камітэту—цалком бязмэтныя,—бо радавы ўрад ніколі, у жадным выпадку, ня прызнае і ня будзе плаціць даваенных даўгоў Расеі.

Цікаўная нарада расейскіх манархістаў у Бэрліне.

„А. Т. Е.“ паведамляе, быццам ў гэтых днях у Бэрліне адбылася важная канфэрэнцыя прыехаўшага сюды „цара Кірылы I“ — з мясцовымі павадырамі расейскага манархізму. Кірыла мае намер аб'яднаць усіх манархістаў быццам дзеля „набліжаючайся акцыі“. Асаблівую сэнсацыю выклікала ўчасьце ў нарадах слаўнага „гэтмана Скарападзкага“, які нядаўна афіцыяльна—„прызнаў вярхоўную ўладу цара Кірылы над аўтаномнай Украінай“... Украіна мае ўвайсьці ў склад адбудаванай расейскай дзяржавы, як „Вялікае Княжства Кіеўскае“ — ясна-ж—з гэтманам Скарападзкім на чале. Быццам, на гэтую „ўступку“ нахілілі Скарападзкага нямецкія манархісты, з Гугэнбэргам на чале, якія за ўсялякую цану імкнуцца да адбудовы даваеннай расейскай манархіі. Так даведалася „А. Т. Е.“.

Нямецкі ваенны інструктар у кітайскай арміі.

Як данесла ўжо прэса, новы кітайскі ўрад запрасіў ведамага нямецкага гэнэрала Людэндорфа на становішча арганізатара і галоўнага інспэктара кітайскай арміі. Але, як дадаюць апошнія весткі, нямецкі ўрад ня хоча даць на гэта дазволу гэн. Людэндорфу. Дык замест яго, як пішуць з Лёндану, мае прыехаць у хуткім часе ў Шанхай адзін з бліжэйшых супрацоўнікаў Людэндорфа ў часе вайны, палкоўн. гэнэральн. штабу—Баўэр. Палк. Баўэр будзе ваенным дарадцам кітайскага ўраду і—на чале цэлага штабу нямецкіх ахфіцэраў —мае заняцца рэарганізацыяй кітайскай арміі.

Румынская сялянская апазіцыя адкідае кампраміс з урадам Братыяну.

На прапазіцыю румынскіх урадавых „лібэралаў“—злажыць уладу зараз-жа пасьля падпісаньня загранічнай пазыкі, каб толькі апазіцыя згадзілася ў парляманьце зацьвердзіць пазыку, ядро апазіцыі — „сялянека-нацыянальная партыя“ — пасьля нарады яе цэнтральнага камітэту—адказала адмовай.

Выданы камунікат заяўляе, што ніякай умовы апазіцыя з „лібэраламі“ заключаць ня будзе, што ўрад Братыяну, як процінародны, ня можа атрымаць загранічнай пазыкі. Партыя заяўляе ў канцы, што адзіны стасунак да ўраду яе, як выражаючай волю народа, гэта—бязумоўная барацьба з... урадам.

Ваенны бюджэт „пацыфічнай“ Францыі

Стоячы „на стражы эўрапэйскага міру“, Францыя ўсьцяж шалёным тэмпам павялічвае свой ваенны бюджэт, вымагаючы адначасна — поўнага разбраеньня Нямеччыны... Ваенныя выдаткі Францыі на 1929 год аблічаны ў суме 7 мільярдаў 680 мільёнаў франкаў,—на 849 мільёнаў больш, як ў папярэднім годзе.

Лёйд-Джордж „ня думае аб выбарнай коаліцыі з работнікамі“.

У артыкуле ў вялікай венскай газэце Лёйд-Джордж заявіў, што ўсе чуткі аб выбарным паразуменьні паміж ангельскімі лібэраламі і „лябурыстамі“ (работніцкай сацыялістычнай партыі)—перадчасныя. Ен, як павадыр лібэралаў, ня можа нічога сказаць, што і як будзе на выбарах. Ня гледзячы на тое, што сучасны ўрад значна скампрамітаваў кансэрватыўную партыю ў краі, лібэралы напэўна ня пойдуць на тое, каб дапамагчы работнікам здабыць ўладу на выбарах... Аб ніякай коаліцыі з работнікамі лібэралы ня думаюць, хаця-б навет прышлося яшчэ 5 гадоў чакаць лібэралам на здабыцьцё партыйнай улады...

Але-ж і работніцкая партыя яшчэ раней—на апошнім кангрэсе рашуча высказалася проці ўсялякай коаліцыі з лібэраламі—у часе выбараў.

„Рэвалюцыя“ ў Пэрсіі.

Весткі з Канстантынопаля кажуць, быццам у Пэрсіі выбуха „рэвалюцыя“, ці вярней—мясцовае паўстаньне проці ўраду шаха. Асяродак паўстаньня — у паўночна-заходняй частцы краю—Табрызе (блізка граніцы з расейскім Закаўказьзем). Пэрсідзкі ўрад, вельмі занепакоены паўстаньнем, выслаў на месца значныя атрады войска. Паўстаньне шпарка пашыраецца. Вестка ня кажа аб характары руху.

Узнаўленьне радава-нямецкіх перагавораў

З Масквы даносяць, што ў палове лістапада маюць узнавіцца радава-нямецкія перагаворы ў справе перагляду гандлёвага трактату.

Новыя ваенныя алярмы нямецкіх карэспандэнтаў.

Нямецкая прэса ў апошнія дні зьмяшчае шэраг карэспандэнцыяў і артыкулаў, якія ўказваюць — у зьвязку з падарожжай марш. Пілсудскага ў Румынію — на тую небясьпеку, якая пагражае эўрапэйскаму міру з боку быццам плянаванага марш. Пілсудскім цясьнейшага ваеннага саюзу між Польшчай і Румыніяй, да якога маюць быць уцягнуты таксама Вэнгрыя і Чэхаслявакія... Саюз гэты мае мець, праўда, толькі абаронны характар. Але—побач з тым плянавана—„стварэньне самастойнай і незалежнай“ Украіны, якая таксама мае ўвайсьці ў агульны „саюз“. У зьвязку з такім вялізарным плянам, быццам, мае быць шпаркім тэмпам разбудаваны ваенны порт у Гдыні — праз які мае ісьці француская ваенная дапамога Польшчы і Румыніі—войскам і амуніцыяй — на выпадак вайны з СССР... Нядаўна, як ведама, такога зьместу (ня вельмі прадуманая) карэспандэнцыя з Букарэшту была надрукавана ў оргаие дэмакратаў „Бэрлінэр Тагэблят“, выклікаўшы рэзкае запярэчаньне запраўды-ж шэрагу недарэчнасьцяў з боку чэхаслявацкага ўраду. Цяпер—пасьля запярэчаньня — такога-ж зьместу, толькі спрытнейшая, карэспандэнцыя ідзе з самае Прагі дый перадрукоўваецца ўсей нацыяналістычнай прэсай Нямеччыны, дадаючы да яе свае тлумачэньні. Прэса піша, што гэты, праўда, „абаронны плян“, аднак-жа „зьмяшчае вялізарную небясьпеку вайны, бо ж з прычыны значнай масы спрэчных і спорных справаў паміж Польшчай і СССР—як у галіне нацыянальнай, таксама і тэрытарыяльнай—пасьля выбуху вайны цяжка будзе разабрацца ў тым, кім ці чым выклікана вайна“...

Карэспанд. „Кур. Варш.“, падаючы гэтыя весткі, кажа, што гэтыя алярмы, як заўсёды, нямецкая прэса пачынае перад маючымі распачацца польска-літоўскімі перагаворамі ў Кэнігсбэргу.

Палепшаньне кітайска-японскіх адносінаў.

Непрымірымае становішча Японіі адносна Кітаю—у цэлым сьцягу спорных справаў у апошні час неяк залагоджваецца.—Трэба думаць—галоўным чынам, дзякуючы тэй апецы, якую новы кітайскі ўрад знайшоў у Амэрыцы. Апошнія перагаворы кітайскага мін. загранічных спраў з японскім гэнэральным консулам у Нанкіне давялі да паразуменьня ў 4 важных пунктах спору паміж Кітаем і Японіяй. Японскі консул згадзіўся прынцыпова на перагляд гандлёвага трактату. Дасягнута паразуменьне і ў справе зьліквідаваньня выпадкаў—у Нанкіне, Ханькоў і Тсінанфу. Спэцыяльна зложаная міжнародавая камісія мае разабраць, хто вінаваты ў крывавых падзеях між кітайскім і японскім войскамі.

Лёнданскія крыніцы кажуць, што, апрача гэтых 4 спорных пунктаў, якія ўжо сталі на шлях вырашэньня, астаюцца нявырашанымі 4 найбольш важныя, паміж імі—спор аб Манчжурыю і канфлікт у справе перагляду мытнай умовы, якую Нанкін абвесьціў страціўшай сілу...

Апошняя тэлеграма з Токіо кажа, быццам перагаворы ў Нанкіне давялі да паразуменьня ў-ва ўсіх амаль актуальных спорных справах паміж Японіяй і Кітаем, асабліва ў справе крывавых сутычак у Нанкіне і Тсінанфу.

Трэба думаць, што паразуменьне асягнута толькі ў гэтых найлягчэйшых справах.

Сэрба-харвацкі канфлікт.

Сэрбскі радыкальны ўрад неразумна робіць, зацягваючы ўсьцяж справу залагоджаньня канфлікту з Харватамі. Апошні вялізарны—40 тысячны—зьезд сялянскай апазіцыі ў Сізаку толькі ўкрапіў няпрымірымае становішча Харватаў. У выніку зьезду, на якім гаварыліся вельмі вострыя прамовы, але які прайшоў у поўным парадку, праграма харвацкіх павадыроў канчальна фармулявана і зацьверджана. Харваты трэбуюць поўнай самастойнасьці краю, толькі праз асобу караля зьвязанага з іншымі краямі Югаславіі (ці так званае—„пэрсанальнай уніі“).

Сэрбскія цэнтралісты заявілі, што на такой падставе ня можа быць мовы аб паразуменьні. У Бялградзе ўскладаюць вялікія надзеі на асабістае ўмяшацельства ў канфлікт караля,—у часе яго падарожжы ў Загрэб на перагаворы з харвацкімі павадырамі.

— Фашысты!.. Дзікун!..

Спадар схапіў за чуб аднаго гімназістага і піхнуў яго на сьцяну.

— Хлопцы! Вязаць яго... Шалее!

I тут добры дзесятак вучняў пачаў увіхацца каля Спадара.

Зьвязалі яму рукі нейкім круцялём, выперлі на падворак, пасьля на вуліцу, клікнулі дрынду і патарабанілі ў шпіталь, проста ў „Жоўты Дом“.

— Маеце,—сказалі там, — новага пацыента: прафэсар, нятыкальны, а гэтак тыча, каго папала, што й веры не дасьцё... Гілюе дый годзі.

— Што з мяне вар'ята рабіць! — зароў на ўсе лёгкія Спадар.—Ня дамся!..

Зьявіўся доктар, і два здаравяцкія хлапцы з шпітальных слугаў пачалі насоўваць на Спадара спэцыяльную сарочку.

Адзін дзень і адну ноч ціхенька прасядзеў у шпіталі Спадар.

Пасьля з яго зьнялі спэцыяльную сарочку і пачалі „бадаць“ дактары.

Задумаліся: вар'ят ні вар'ят, а нешта вельмі да яго падобнае.

Адзін доктар кажа:

— Ахвяра біблейскага грэху!

Другі кажа:

— Маніяк!

Трэці:

— Э, ды тут усё, здаецца, разам сплялося!

Аднак, рашылі выпусьціць на волю Спадара.

Выйшаў ён, небарака, з „Жоўтага Дому“ і пяруном пасмаліў у свой „Гаспадарчы Зьвяз“.

Як на бяду там быў у гэты час адзін нямілы Спадару студэнт-беларус.

— Вы што гэта? — зьвярнуўся Спадар да зьдзіўленага студэнта,—салідарызуецеся, значыцца...

— Што?.. З кім салідарызуюся?—пытаўся зусім аслупеўшы студэнт.

— Як то што?!. А з тымі згаджаецеся, што мяне ўчора аж вун куды зацягнулі! Вар'ятам мяне зрабіць хацелі!

— Выбачайце,—адказаў студэнт,—вар'ятам можна зрабіць таго, хто яшчэ хоць крыху нармальны... А вы...

— Што вам я?!. Памятайце, што я нятыкальны!—закрычаў Спадар на студэнта.

— Для паліцыі, дык мо' вы і нятыкальны, а так, дык не, бо да вас-жа, самі кажаце, учора даткнуліся, — спакойна адказаў студэнт.

— Ах, ты жу...—зароў ад злосьці Спадар і замахнуўся на студэнта.

Студэнт засланіўся тэкаю, а ў адказ гэтак мазануў па Спадаровым аблічча, што ледзь бліна з яго не зрабіў.

Мала гэтага.

Назаўтра да Спадара прыйшлі два сэкунданты ад студэнта, каб гэта сатысфакцыі патрэбаваць, значыцца.

Спадар накінуўся і на сэкундантаў:

— Чаго вам тут? Ратунку няма!.. Ня дам разваліць Зьвязу!

— Ды мы не да Зьвязу вашага, а проста да вас... Вы ўчора зьняважылі нашага калегу,—адказвалі студэнты.

Пачуўшы гэта, Спадар выскачыў за дзьверы, на якіх напісана было „Начулішча“, і замкнуўся там.

Але назаўтра паслаў аднаго з сваіх спадаронкаў на мір да свайго праціўніка. Той патрэбаваў фармальных сэкундантаў, адмаўляючыся ад усякіх перагавораў з Спадаром.

Бедныя сэкунданты: сустрэўшыся, каб разабраць гэткі канфлікт, пералічылі выпадкі, дзе, калі і колькі разоў хто хрысьціў Спадара. Выпадкаў аказалася даволі шмат.

I пастанавілі:

Лічыць Спадара нядуэлездольным.

Што будзе далей, сказаць трудна. Але, бяручы пад увагу, што на дварэ глыбокая восень, трэба думаць, што навет і Спадар гілявацъ пакіне:

Бо холад яго вылячыць. **Picolo.**

Наша хроніка.

Канфіската. По загаду Старосты Гродзкага на м. Вільню сканфіскаваны папярэдні 7-мы нумар газ. „Слова Працы“, за зьмяшчэньне наступных артыкулаў — перадавіцы „Полярызацыя сілаў“, „Дзесяць гадоў“, „Пад клясавым штандарам“ і інш.

А таксама сканфіскаваны № 8 газэты „Слова Працы“ за перадавіцу пад загалоўкам: „Да апошніх падзеяў у Віленскай Беларускай Гімназіі“ за фэльетон „Маленькія, але разумныя“ і заметку — „З Т-ва Бел. Школы“.

Закончаньне працэсу 35 грамадаўцаў. На другі дзень працэсу проці 35 быццам сяброў камуністычнай партыі Зах. Беларусі суд выслухаў сьведак, як з боку пракуратуры, так і з боку абароны. Сьведкі пракуратуры гавораць, што падсудныя выявілі найактыўнейшую дзейнасьць толькі ў 1926 годзе, калі распачалі акцыю ў кірунку выкліканьня паўстаньня, абяцаючы помач суседняй дзяржаве. На цэлых абшарах Маладэчанскага, Ашмянскага і Сьвянцянскага паветаў, пачалі ўвіхацца агітатары, склікаўшыя сабраньні, на якіх гаварылі падбурваючыя прамовы і зьбіралі складкі на карысьць вязьняў—„камуністаў“. Названыя паветы складалі раён, на чале якога стаяў нейкі Зіновіч, а па ўцечцы яго ў СССР гэтую функцыю выпаўняў абвінавачаны Семашкевіч. 14 жніўня адбыўся ў Лебедзеве зьезд, на якім быццам быў прадстаўнік ад ЦК КПЗБ, і пастаноўлена ўступаць у легальныя тады партыі, як НПХ і „Грамаду“.

Далей прыступлена да разгляду „dowodów rzeczowych“, як сьцягаў, карэспандэнцыі, квітоў, літэратуры і г. д.

На трэці дзень працэсу быў прачытаны прыгавор суда, якім 13 чалавек апраўдана, 12 засуджана на кары, якія ўраўнаважыліся амністыяй і дасудовым вастрогам, рэшта 10 засуджана ад 2 да 4 год, цяжкага вастрогу. Адзін з іх—Роўны — засуджаны на год крэпасьці.

Засуджаныя на цяжкую турму прынялі прыгавор спакойна.

Цікавы выпадак з былым пасламі Валошынам. Ня так даўно адміністрацыя турмы ў Равічах, дзе знаходзіцца былы пасол Валошын, абвесьціла яму, што ён звольнены з турмы. Калі зьдзіўлены Валошын запытаўся: „на якой падставе“. Дык яму адказалі: „не разважаць і хутчэй апранацца“.

У канцэлярыі турмы яму перадалі дакумэнты аб звальненьні. Лічучы тое, што рабілася, за галюцынацыю, Валошын яшчэ запытаўся: „А як-жа з маімі сябрамі, ці яны таксама будуць звольнены“? Яму таксама і тут адказалі: „не разважаць“. Не разумеючы да канца, у чым справа і не жадаючы папасьці ў нейкую пастку, Валошын заявіў, што ён без сваіх сяброў з турмы ня выйдзе. Адміністрацыя мусіла званіць у Вільню і даведацца, у чым справа. Пасьля высьвятленьняў Валошын астаўся ў турме. Як перадаюць, выясьнілася, што за пасламі Валошынам, апрача агульнае справы, лічыцца шмат і драбнейшых спраў. Як відна, за адну з гэтых спраў Валошын адбыў кару і суд, відаць, забыўшыся, што справа ідзе аб пасьле Валошыне, чуць ня звольніў яго.

Адным словам чуць ня сталася сэнсацыя.

Новая судовая справа. Як інфармуюць, проціў былога пасла Рак-Міхайлоўскага ўзьнікла новая судовая справа, у якой навет закончана сьледзтва і ўжо матар'ялы адсланы віленскай пракуратуры. Абвінавачваюць Сымона Рак-Міхайлоўскага з арт. 129, ч. III К. К. за справаадаўчы мітынг адбыты ў м. Лоску ў 1924 г. аб працы Беларускага Пасольскага Клюбу.

Дабрадзействы амністыі даткнуліся і засуджанага на 12 гадоў былога пасла Рак-Міхайлоўскага, але яму даравалі 3 месяцы кары, на якую ён быў засуджаны судзьдзёю пакою, за нібы надрукаваньне нейкіх адозваў. Есьць чаго радавацца і дзякаваць.

Вынікі неадбытага зьезду Т-ва Белар. Школы. Як нам перадаюць, у зьвязку з зьездамі Акружных Управаў Т-ва Белар. Школы на мясцох пачаліся знаёмыя нам „баданьні“ і „затрыманьні“ паасобных працаўнікоў Т-ва.

У Горадні падробленым такім бадань нем усе дэлегаты на агульны зьезд, а ў памяшчэньні Управы зроблена рэвізія і забраны пратаколы пасяджэньняў Управы і Акружнога Зьезду, а таксама і іншыя справы. Дэлегатаў прадзяржалі па цэлым дню і адпусьцілі, папярэдзіўшы, што „ня зусім“.

Ці не перакінулася праца нашай санацыі і на правінцыю.

Літоўская прэса аб канфіскатах беларускай радыкальнай прэсы. 19 нумар выходзячага ў Вільні літоўскага 2-тыднёвіка „Жыцьцё Народу“ зьмяшчае заметку, што „ўжо ўсе прывыклі да сыстэматычнага канфіскаваньня органу беларускіх радыкалаў, які ўжо зьмяніў столькі назоваў, што запраўды ня ведама, які яго чародны назоў. Аднак, „Гродзкае Староства“ не пазваляе жартаваць і „Маланцы“, якая таксама дачакалася часьцейшых канфіскатаў. Каб беларусам ня было крыўды, сканфіскавана на пацеху па кароткай „перадышцы“ „Vilniaus Aidas“. Падаючы гэтую ведамасьць, пашкадаваная рэдакцыя толькі дадумываецца, за што была канфіската“.

У справе працэсу „Грамады“. Нам перадаюць, што, апрача адвакатаў, апэляцыю на прыгавар Акружнога Суда ў Вільні злажылі і самі засуджаныя.

Календар на 1929 г. Ужо заканчваецца друкаваньне і праз 2 тыдні выйдзе ў сьвет кніжка—Календар Выдавецкага Т-ва на 1929 г. Фармат кніжкі ў два разы вялікшы, чым у мінулым годзе (11 аркуш.). Кніжка будзе каштаваць прыблізна 1 зл. 50 грош., мо' навет трохі даражэй, зьмест вельмі багаты, складаецца з 12 адзелаў. У календары зьмешчаны цэлы рад фатаграфій павятовых зьездаў Т-ва Белар. Школы, народных дамоў, драмат. і музык. кружкоў, бібліятэк-чытален і т. д.

У справе заказаў зварочвацца па адрасу: „Wilno, ul. Ostrobramska № 1, księgarnia Białoruska Wydaw. T-wa.

„Сон Гаўрылы“. Надовячы выйшаў з друку маленькі зборнік вершаў Улад. Ініцкага, пад загалоўкам „Сон Гаўрылы“.

Ня гледзячы на некатарыя (тэхнічныя) заганы, зборнічак наагул досыць цікавы, толькі незразумела пасьвячэньне аўтара:

„Вам, браты мае, сястрыцы
I ўсей шляхце, як з Ініцы,
Так з ваколіцаў Міра
I ўсім тым, каго зямля
Беларускае трымае —
Кніжку гэту пасьвячае“
Аўтар.

„Зарніца“ памрысе скідае маску. Няма места (і сэнсу) разглядаць хоць больш-менш падрабязна беларускую згодніцкую прэсу, бо яе і так ведаюць беларускія працоўныя гушчы. Але нельга прапусьціць некатарых запраўды гумарыстычна выходзячых „вочак“ гэтай прэсы. Так у № 3 „Белар. Зарніца“ ў артыкуле: „Рукі прэч“, між іншым, піша: „Беларускія царкоўна-грамадзкія дзеячы (з пад „Зарніцы“—Рэд.) імкнуцца да зблізжэньня духавенства з народам (бясспрэчна спадаровым! — Рэд.) дзеля ўзмацаваньня і палыбленьня праз роднае веры (?!) дабра царквы, народу (спадаровага і „ижэ с ним“—Рэд.) і самога духавенства“...

„Беларуская Зарніца“ мае на мэце ўзмацаваньне роднае веры (ў залатога бога — Рэд.) ад уціску яе праз каго-бы то ні было (пэўна белар. рад. прэсы, дэмаскуючае яе ў вачох беларускіх працоўных гушчаў!—Рэд.), абчышчэньне яе ад чужацкіх (?!) элемэнтаў (пэўна „вывротовых“) і г. д. і ўсім тым, хто будзе шкодзіць у гэтай „працы“ (!) кажа: „рукі прэч“!

У другім артыкуле („Агляд прэсы“) „Зарніца“ вельмі расхвальвае „Спадара“ за яго перадавіцу ў „Народзе“, „Новая пара ў бе-

ларускім руху", дзе Спадар расхвальвае Каўша.

Праўда, што новая пара (гнядых!) запражаных у крамку-воз (зьвяз). Але нешта іх воз йдзе „колькі ўбіў, толькі ўехаў" і то ня ўперад, а ўзад.

Павялічэньне паліцыі. Дзяржаўны Урад Пасярэдніцтва Працы ў Вільні мае ў сваей эвідэнцыі запатрэбаваньне на „większą ilość" (на больны лік) кандыдатаў на пастарунковых Дзяржаўнай Паліцыі.

„Безработныя, рэфлектуючыя на гэта, павінны зьвярнуцца да гэтага ўраду".

Як бачым, дык яшчэ паліцыі „мала" на „Крэсах".

Падслухоўваючая станцыя. Варшаўская прэса („Rzeczpospolita" № 299) падае, што ў раёне Івянца польскія пагранічнікі выкрылі на польскім абшары радавую падслухоўваючую станцыю, якую, натуральна зьнішчылі.

Лоўкі манэўр машыністага. На днях Стаўпцы былі сьведкамі спраўнасьці бальшавіцкага машыністага. У цягніку, які праходзіў церав Стоўпцы у адным з сярэдніх вагонаў раптоўна сарваліся сцэпы. Лоўкім і хуткім прыёмам машыністага, цягнік быў затрыманы і гэтым мапярэджана няўхільная катастрофа з цягнікам.

Новая партыя асаднікаў. Міністэрства Зямельных Рэформаў прыгатавала надзяленьне зямлёй вайсковых інвалідаў у паветах: Віленска-Троцкім, Ашмянскім, Сьвянцянскім, Браслаўскім, Пастаўскім, Дзісьненскім, Вялейскім Маладэчанскім, Валожынскім і Лідзкім. Гэты праект будзе прадстаўлены дзеля разгляду і зацьвярджаньня на пасяджаньні Рады Міністраў, якое мае адбыцца на гэтым тыдні. Калі гэты праект зацьвердзяць, дык хутка новая хваля асаднікаў паплыве сеяць „культуру" на нашай зямліцы.

Ну, беларускі селянін напэўна чакае дарагіх госьцікаў?..

Забурэньні ў школах. Прэса падае, што апошнімі днямі ў жыдоўскай гімназіі ў Слоніме выбухла забастоўка вучняў, якія захацелі 15 проц. падбаўкі платы. Адначасна ў паблізкай ральнічай школе ў Жыраве выбухла вучнёўская пратэстацыйная забастоўка проці датагачасных выхаваўчых мэтадаў дырэкцыі школы. Забастоўка выклікана звальненьнем 2-х вучняў, з якіх адзін застрэліўся.

Трэба адзначыць, што такія „забурэньні" здараюцца ў Польшчы чым далей, то часьцей і паважней.

Арыгінальны напад на цягнік. Згодна з інфармацыямі прэсы, надвячы сярод белага дня, ня ведамыя асобы „збамбардавалі" каменьнем асабовы цягнік, едучы з Баранавіч у Лунінец. Вынікам бамбардыроўкі зьяўляюцца колькінаццаць выбітых вокан, абломкамі шкла якіх ранена 5 чалавек.

На Валожынскім магільніку. Згодна з віленскай прэсай, на Валожынскім магільніку, на магіле камісара паліцыі, лёгшага ў барацьбе з „дывэрсантамі", ня ведама кім паламаны крыж і збурана (зраўнавана з зямлёй) верхняя частка магілы. Дадумваюцца, што гэта помста з боку былых дывэрсантаў, або іх сваякоў. Сьледзтва, ведама, што йдзе энэргічна.

Арышт агітатараў (?). Згодна з прэсай, у Івянецкім раёне, каля Стахоўшчыны, арыштавана 5 чалавек, якім закідаецца камуністычная агітацыя.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Далоў глупствы!

(В. Дубічы-Царкоўныя, Бельскі павет).

У вёсцы Дубічы-Царкоўныя ў мінулым тыдні пасьля доўгіх запрошаньняў прыехаў „kierownik Stowarzyszenia Spożywców", дзеля залажэньня каапэратыўнага склепу.

Як даведаліся сяляне аб гэтым, то хутка прышлі і адразу набралася каля 20 сяброў. Шмат яшчэ хто падпісаў-бы дэклярацыі, але на той час ня мелі грошаў, з повяду надыйшоўшых падаткаў. Далей вызначылі скляповага. „Kierownik" апавясьціў, што скляповы чалавек павінен быць адпаведны добра граматны, бо ня толькі павінен умець зважыць і прадаць, але, апрача таго, вясьці культурна-асьветную працу, далей павінен быць сумленны і ня заняты гаспадаркай. Усе сябры аднагалосна ўказалі на жыхара Трахіма Панфілюка. Пасьля Тарас Тамашук пачаў кіраўніку набівацца сваім сынам Васькай, каб выбралі яго скляповым. Асабліва аб гэтым пачаў клапаціцца Павал Анасучук, бо ён сам хацеў быць скляповым, але ведаў добра, што сябры не дапусьцяць яму ўлезьці туды, то ён нашоў сабе сябру.

Так яны і зрабілі — два сябры проці волі ўсіх астальных. Сяляне, пабачыўшы такую няпраўду, абурыліся. Некаторыя з сяброў пачалі забіраць свае складкі назад.

Перад канцом сходу п. „kierownik" сказаў, што Трахім Панафілюк ня можа быць скляповым „z powodu podejrzania jego w polityce".

Статут „Stowarzyszenia Spożywców" аб гэтым нічога ня кажа і выняткаў розных ня мае, але-ж што Статут, як новы скляповы зафундаваў сваім хадатаям абед з гарэлкай.

У такім выпадку гарэлка — не магла пашкодзіць нашаму новаму скляповаму ў яго бабтыстычным пераканеньні. На колькі спачатку жыхары былі заахвоціўшыся за каапэратыўны склеп, то цяпер на столькі зрабіліся апатычнымі, дзякуючы тэй камбінацыі з скляповым. Сорамна нам, браты, глупствам займацца!

Мы ўсе шчыра павінны ўсяцца за арганізацыю каапэратываў, бо ў арганізацыі моц!

Дубіцкі.

Праца нашага каапэратыву.

(В. В.-Кракотка, Слонімскага павету).

З балянсаў нашага каапэратыву відаць, што ў працягу 9 месяцаў каапэратыў зрабіў на 5187 зл. 46 гр. абароту, гэта значыць абярнуў сваім капіталам каля 10 разоў. Вынік такі: у першым годзе можна лічыць за добры. Аблічэньне склепу на 1.X—28 г. выказала чыстага даходу 379.73 зл.

Каапэратыў моцна адчувае недастачу грошай да абароту. Дзякуючы маламу капіталу, каапэратыў змушаны рабіць частыя закупы ў горадзе, што пацягне за сабою вялікшыя затраты часу і грошай.

Аднак, паміма перашкод, якіх каапэратыў мае—дзякуючы недастачы капіталу—каапэратыў разьвіваецца. Сьвядомасьць сярод сялян расьце, як відаць з таго зацікаўленьня, якое выявілася на сходзе сяброў каапэратыву 14-га кастрычніка г. г.

Перад сабою каапэратыў мае шырокае поле дзеяльнасьці. Пакуль што каапэратыў вядзе працу толькі ў галіне спажывецкай. Аднак, на сходзе сяброў 14.X 28 г. сялянесябры вельмі жыва абгаварвалі справу супольнага закупу сельска-гаспадарчых машын і штучных гноёў да агульнага ўжытку.

Сяляне нарэшце зразумелі карысьць належаньня да каапэратыву. Супольным упорам, высілкамі сябры нарэшце збудуюць свой дабрабыт.

На чале ўправы каапэратыву стаяць энэргічныя і сумленныя людзі, дзейнасьцю іх і ахвярнай працай будучыня каапэратыву забясьпечана.

Сябра каапэратыву.

Трохі і пра Вялейскі Соймік.

Дня 22 траўня г. г. у зьвязку з асабістымі справамі давялося мне быць у Вялейскім магістраце, дзе адбывалася пасяджаньне сяброў Вялейскага павятовага сойміку. Парадку дзеннага ўсяго ня помню. Разглядаліся справы ўхваленьня дадатковага бюджэту і выбары сябры ў ваяводзкую раду. Як я бачыў, дык і тут без правіцы і лявіцы не абышлося. Падчас выбараў сябры правіцы выставілі свайго кандыдата, абшарніка Бароўскага, а лявіца—Субача. Правіца стала выстаўляць з лявіцы, каб разьбіць галасы; некатарыя сябры з лявіцы зразумелі хітрасьць правіцы і сталі выстаўляць правіцу, але правіца паздымала з сябе кандыдатуры, пазаставіўшы аднага п. Бароўскага. Гэтым і разьбіла галасы лявіцы. Гэткім чынам і застаўся выбраны пан Бароўскі. Дык вось, паважаная лявіца, трэба пільна глядзець на справу і сачыць за хітрасьцямі правіцы. Лявіцай быў унесены ўнёсак аб ухваленьні на Беларускія гімназіі 800 зл. Справу гімназіяў высьвятляў Субач, але не абышлося і тут бяз укораў правіцы па адрасу Бел. Гімназіяў. Асабліва пан Бароўскі нападаў на Радашкоўскую Гімназію, што яна „бальшавіцкая", што з яе ўсе вучні ўцякаюць заграніцу да бальшавікоў вучыцца. Пасьля дыскусіі старш. запрапанаваў галасаваньне з падняцьцем рук, перш заўваленьне 800 зл. Лявіца падняла рукі і калі правіца заўважыла, што на лявіцы большасьць, дык правіца не адважылася і крануцца з месца, ба ўсё роўна бачыла, што нічога не паможа. Гэткім чынам і было ўхвалена 800 зл. для Віленскай Бел. Гімн. Дык вось, каб у кожным разе так перамагалі, скора б мы дайшлі да лепшага жыцьця. Справы свае ў магістраце скора залатвіць не ўдалося, прышлося чакаць аж да заканчэньня пасяджаньня сойміку, тут я прыглядаўся як вырашаліся і другія справы. Як відаць па вонкаваму выгляду, дык лявіцы большасьць асабліва заўважыў падчас абеду, што многія з сяброў пайшлі шукаць, каб дзе зьесьці селядца, а многа менш папёрла ў клюб ужэднікаў на цяляціну, гусяціну і парасяціну.

Дрыль-унsocі.

Двухязыковая школа.

(В. Пагарэлка, Яраміцкая гм., Стаўпецкі пав.).

Два разы падавалі сяляне нашай вёскі дэклярацыі з жаданьнем ператварэньня існуючай польскай школы на беларускую. У адказ на падвойка пададзеныя дэклярацыі, далі нам двухязыковую (утраквістычную) школу. Пакуль што засталіся задаволены й гэтым: Паглядзім, якое вучэньне будзе ў двухязыковай — казалі старэйшыя. У пачатку палавіны мінулага школьнага году (было гэта якраз у выбарчыя часы) здавалася будзе добра, кожны дзень была беларуская мова, а польская адзін раз у тыдзень. А вось у гэтым годзе, ужо зусім іначай: польская мова кожны дзень, а аб беларускай мове ні слуху, ні духу. Але за гэта асаблівая ўвага зьвернена „na pisanie i roboty ręczne". Кожны вучань павінен мець каля 12 спыткаў, на якіх амаль нічога ня прыходзіцца пісаць; кожны павінен мець некалькі аркушоў каляровай паперкі, клей і інш. усё гэта для работ. Маюць па некалькі спыткаў і тыя вучні, якія першы год ходзяць да навукі. Яны прахадзілі ўжо месяц і, ня толькі адной літары ня ведаюць, а навет лемантара ў вочы ня бачылі і хаця-б польскага! Вось і заходняя культура!

Сяляне павінны вясьці далей барацьбу за родную школу, аж пакуль не пераможуць.

Нядоля.

Дзе дзяюцца народныя грошы.

(Маладэчанскі пав.).

Шмат бяруць у нас розных падаткаў. Але трэба паказаць, дзе яны дзяюцца! Дык вось, нашыя паны задумалі вясною пасадзіць дрэва на гасьцінцы з м. Лебедзева да м. Маркава. Але, мусіць, доўга думалі, як паказаць „заходнюю культуру", ды спазьніліся, бо тагды сталі садзіць, як дрэўкі пачалі распускацца. Як гэта рабілася, ня варта пісаць, гэта відаць з таго, што прынялося толькі 10 проц., а грошы за ўсе заплочана. Дык вось, дзе дзяюцца народныя грошы. „Нашыя" ўрадоўцы, замест таго, каб зрабіць у час, наўмысна адцягнуць работу, а тагды ізноў трэба садзіць, а сялянам—падаткі плаціць.

Бедны.

Нам пішуць з вёскі яшчэ, што:

— **У в. Крымна** быў нейкі п. Б. сэкрэтаром гміны, а разам і сэквэстратарам. Езьдзіў ён па вёсках ды апісваў апошнія маяткі ў згалеўшых і так сялян. Але сколькі сяляне не плацілі падаткаў, усё-ж не хапала. Вось аднойчы прыяжджае кантроль. Зрабілі рэвізію. Па абліченьню і праверцы ўсіх падатковых кніжак, аказалася, што перабору было зроблена на некалькі тысяч. Прыйшлося нашаму „дзеячу" iсьці за краты, але... знайшоўся „панок", які за яго паручыўся і ён застаўся на волі. Хутка быў вызначаны суд. Зьехалася вельмі шмат сьведак (пакрыўджаныя сяляне). Абвінавачаны вельмі спалохаўся, так што доктар прызнаў яго „псыхічна хворым". Суд адлажылі; калі будзе наступны—ня ведама.

Камэнтарыяў не патрэбна.

— **У м-ку Моўчадзі**, Баранавіцкага пав., на Усьпеньне поп Моўчадзкае царквы, аблаяў сваіх парахвіян за тое, што яны не даюць ахвяр на царкву і накінуўся на тых сялян, якія пазналі ўжо папоўскую „праўду" і адвярнуліся ад яе. Праз поўгадзіны а. Мікалай пасылаў „пяруны і маланкі" на не паслушных „авечак", называючы іх цёмнымі людзьмі, закідваючы ім прыхільнасьць да дзяржавы, у якой не прызнаюць „храма божага", а „слугаў божых" як наш айцец, перасьледуюць.

Цікава, што а. Мікалай не назваў дзяржавы, у якой „слугі божыя" перасьледуюцца! На сколькі нам ведама, то гэтых перасьледуюць у Мэксыцы за тое, што яны паўсталі з аружжам у руках, каб адбіць „свае" маёнткі, якія канфіскавала дзяржаўная ўлада. Але, як можна было судзіць з прамовы, а. Мікалай меў на думцы СССР, аднак, там „слугі божыя", здаецца, не перасьледуюцца, а толькі пазбаўлены ўрадавай дапамогі, паміраюць собскай сьмерцяй.

„Бязбожнікаў" ён абвінавачвае ў тым, што яны могуць ашукваць і наагул рабіць розныя „безбожныя дела". Але калі прыглядзіць „цёмныя і лукавыя" „дела" а. Мікалая, то лепшага „майстра" хіба ня знойдзеш. Бо хто не шкадуе жывых і мёртвых? — а. Мікалай! Хто ўзяў двайную плату за мэтрыку, а калі ў беднай жанчыны не хапіла да 20 зл. аднаго злотага, дык паслаў пазычаць да жыда,—а. Мікалай! Хто падчас шлюбу за 20-ці грашовую сьвечку бярэць злот?—а. Мікалай і г. д. і г. д.

Ня дзіва, што „авечкі" перастаюць быць авечкамі і пачынаюць абходзіцца і без айцоў Мікалаяў.

Дзед Мацей.

З Радавае Беларусі.

Сярод пісьменьнікаў, паэтаў і літэратараў.

У сьнежні месяцы гэтага году адбудзецца дваццацігодьдзе літэратурнай дзейнасьці Цішкі Гартнага.

Для сьвяткаваньня юбілею пры Наркомасьветы БССР зложана камісія.

— **Якуб Колас** падрыхтаваў да друку другі том сваіх твораў. Першы том хутка выйдзе з друку ў Беларускім Дзяржаўным Выдавецтве. Біяграфічна-крытычны артыкул да збору твораў Я. Коласа напісаў У. Дзяржынскі.

— **З. Жылуновіч** падрыхтаваў да друку зборнік крытычных-артыкулаў аб беларускай літэратуры: „Узгоркі і нізіны".

— **Тодар Глыбоцкі** здаў Белар. Дзяржаўнаму Выдавецтву зборнік сваіх літэратурна-крытычных нарысаў пад назвай: „Пра літэратурныя справы".

— **Алесь Гародня** напісаў новую п'есу-сатыру з жыцьця Зах. Беларусі пад назвай: „Пісар пана Куркуса". Гэты-ж аўтар піша цяпер вялікі артыкул аб клясавай дыфэнцыяцыі ў беларускай літэратуры.

— **Тэатр, мастацтва, музыка.** Другі Беларускі Дзяржаўны Тэатр мае перарабіць для пастаноўкі ў наступным сэзоне апавяданьне Цішкі Гартнага: „Гаспадар". Сябра Аб'яднаньня пісьменьнікаў „Полымя" А. Ляжкевіч здаў у Беларускае Дзяржаўнае Кіно сцэнары „Сеяла вясна", паводле апавяданьня Якуба Коласа „На прасторах жыцьця". Хутка пачнуцца здымкі. Далей Ляжкевіч прыступае да апрацоўкі кіно-сцэнарыяў, паводле п'есаў Ц. Гартнага: „На стыку" і „Дзьве сілы".

— **Пісьменьнікам А. Вольным** напісаны для Беларускага Дзяржаўнага Кіно сцэнары карціны „Атаман Муха". Карціна мае быць гатовай к зіме бягучага году. А. Вольны працуе над камэдыяй з беларускага жыцьця, якую таксама набывае Беларускае Дзяржаўнае Кіно для пастаноўкі.

— **Калегія Наркомасьветы** Канчаткава вырашыла пытаньне аб арганізацыі ў Менску ў гэтым годзе беларускага дзіцячага кіно-тэатру. Апошні будзе знаходзіцца ў памешканьні кіно-тэатру—„Пралетары". Тэатр будзе трымаць курс на арганізаванага гледача.

— **Кіно камітэт** зацьвярдзіў сцэнары: „Пагранічныя слупы" з жыцьця пагранічных беларускіх вёсак, прадстаўлены трупай маскоўскіх пісьменьнікаў і сцэнарыстых.

— **Беларуская Акадэмія Навук.** Урад Савецкай Беларусі пастанавіў ператварыць Менскі Інбелкульт (Інстытут Беларускай Культуры) ў Беларускую Акадэмію Навук.

— **Далейшая беларусізацыя ў Рад. Беларусі.** Урад Беларускае Савецкае Рэспублікі пастанавіў рашуча праводзіць далейшую беларусізацыю ўсіх галінаў жыцьця Рэспублікі. Згодна з інфармацыямі прэсы, за няведаньне беларускае мовы толькі ў 2 раёнах (Менскім і Полацкім) будзе звольнена са службы 2,000 ўрадоўцаў.

Паштовая скрынка.

Любчанскаму бедняку. Ня можам зьмясьціць, бо немагчыма прачытаць: надта нявыразна напісана. Напішыце яшчэ раз, але выразна і чарнілам. — **Колі Паслушнаму.** Вашу карэспандэнцыю надрукуем. Пішаце Вы зусім добра, дык прысылайце надалей карэсп. з жыцьця Відзаў і ваколіц. — **Марыі Кароцькай.** Вашыя вершы з папраўкамі надрукуем. Каб больш пашырыць свой талент, трэба, каб Вы чыталі творы беларускіх паэтаў. Спрабуйце пісаць карэспандэнцыі з жыцьця сялян, сярод якіх Вы знаходзіцеся. Наагул, у сваіх творах Вы павінны даваць абраз таго цяжкога і прыгнечанага жыцьця, у якім знаходзіцца працоўная жанчына, ці наагул працоўны народ! Чакаем далейшых Вашых прац!— **Зорнаму.** Газэта Вам высылаецца. З карэспандэнцыі скарыстаем.—**Цярплівому.** Пішыце карацей, падаючы найбольш яскравыя факты, з прысланага скарыстаем.—**Агню.** Пішыце на адным боку паперы і карацей. З прысланага скарыстаем. Дзякуем. — **Горнаму.** Пішыце як найкарацей, бо каб зьмяшчаць Вашыя карэспандэнцыі, дык трэба было-б не зьмясьціць цэлы рад артыкулаў.—**Справядліваму, М. Тулю, Т. Разаку, Дуброве, Сымону Зорцы, Прысутнаму.** Ад Вас усіх карэспандэнцыі атрымалі. Агульная просьба: пішыце як найкарацей, бо 1) вельмі шмат ёсьць карэспандэнцыяў; 2) шмат застаецца карэсп. дзякуючы частым канфіскатам нашай газэты. З прысланага скарыстаем. Пішэце і далей.— **Свайму.** Дайце спакой са сваімі карэспандэнцыямі, бо Староста Гродзкі грозіць нашаму Рэдактару за падобныя артыкулы—артыкуламі з кодэксу карнага, а чытачам—канфіскатай газэты. Гэтага нам доўга ня прыходзіцца чакаць.

Рэдактар-Выдавец: П. Пяткун.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.